2. *Липай, И. Н.* Музыкальная культура Минска: состояние и тенденции развития на рубеже XX–XXI вв. / И. Н. Липай. – Минск : БГУКИ, 2013. – 176 с.

3. *Петровская, И. Ф.* Источниковедение истории русской музыкальной культуры XVIII – начале XX века / И. Ф. Петровская ; Ленингр. гос. ин-т театра, музыки и кинематографии. – 2-е изд., доп. – М. : Музыка, 1989. – 318 с.

# ЦЭЛАСНЫ АНАЛІЗ КАСМІЧНЫХ СЮЖЭТАЎ І ВОБРАЗАЎ У ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКАГА МАСТАКА Я. Н. ДРАЗДОВІЧА («КАСМІЧНЫ» ПЕРЫЯД ТВОРЧАСЦІ)

***Н. А. Лінькова,***
*майстар вытворчага навучання кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Язэп Нарцызавіч Драздовіч (1888–1954) – адметная, унікальная асоба ў беларускай культуры. Гэты майстар заўсёды будзе вылучацца сярод сваіх суайчыннікаў. Спадчына Язэпа Драздовіча, якая захавалася па сённяшні дзень, вельмі багатая і шматбаковая.

Асобнае месца ў дзейнасці гэтага мастака займаюць унікальныя даследванні космасу на пачатку 1930-х гадоў (адлік «касмічнага» перыяд яго творчасці). Яго касмічная тэорыя і мастацкія абагульненні ўжо даўно сталі класікай і яскравай культуралагічнай з’явай свайго часу. Акрамя мастацкага адлюстравання Космасу ў жывапісе і графіцы больш дастатковае ўяўленне пра касмалагічныя пошукі Я. Драздовіча складваецца на падставе яго шматлікіх рукапісаў, кніг і манаграфій.

Тэарэтычныя пошукі Я. Драздовіча грунтаваліся на тэорыях і гіпотэзах касмалогіі і астраноміі пачатку XX ст., а таксама, па ўласным азначэнні, на «снах-касмавізіях», «самнамбулістычных» (пад час сна) падарожжах у іншыя светы. Касмалагічныя тэзісы Я. Драздовіча былі цалкам арыгінальныя і шмат у чым аспрэчвалі палажэнні тагачаснай навукі.

Касмічныя пейзажы Драздовіча – адна з самых загадкавых і маладаследваных старонак яго творчасці, як і ўвесь «касмічны» перыяд ў яго творчасці (1930–1954). Адзначым, што фарманне творчасці Я. Драздовіча адбылося пад уплывам мастацтва мадэрна, у час напружаных пошукаў далейшых шляхоў

развіцця сусветнай культуры і нацыянальных варыянтаў мастацтва будучага. Бясспрэчны ўплыў карцін літоўскага мастака і кампазітара Мікалоюса Чурлёніса (1895–1911) на творчасць Драздовіча. Менавіта Чурлёніс даў першапачатковы магутны імпульс мастацкага азарэння, што выявілася ў ранніх сімвалічных творах, а праз некалькі гадоў – у касмічных серыях Драздовіча [3, с. 185].

Вядома больш за 100 жывапісных і графічных твораў Я. Драздовіча на касмічную тэматыку. Яны складаюць тры вялікія цыклы: «Жыццё на Марсе» (1931), «Жыццё на Сатурне» (1932), «Жыццё на Месяцы» (1932) [2, с. 7].

Асаблівую увагу нададзім серыі «Жыццё на Месяцы», якая прадстаўлена ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь больш дакладна, чым астатнія. Гэта альбом малюнкаў і сем асобных графічных твораў 1932–1933 гг. Графічныя творы гэтай серыі магчыма ацэньваць з розных пунктаў гледжання. Аналіз і сістэматызацыя іх даюць уяўленне пра тое, як ствараліся вядомыя мастацкія творы, як Язэп Драздовіч пазнаваў Сусвет. Суцэльнасць мастацкага твора, паслядоўнасць і дасканаласць аўтарскага тэксту, апісанняў да малюнкаў складаюць агульную карціну свету, у якую арганічна і гарманічна ўключаецца і касмічнае жыццё [3, с. 9].

Альбом «Жыццё на Месяцы» з’яўляецца адным з найкаштоўнеўшых экспанатаў у фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Яго поўная назва «Album Зарысовак да апісаў «Жыцьця на Месяцы» 1932 (…На Арыяполь і Трывеж…)». Гэты альбом складаецца з 33 старонак, якія спачатку існавалі паасобку, а потым былі сабраны аўтарам разам і аддадзены ў пераплёт, памер альбома 20,5×27 см. Дадзены альбом быў не адзіны ў сваім родзе, такіх альбомаў было не менш за 7.

Альбом «Жыццё на Месяцы» – мастацкая справаздача двух самнамбулістычных падарожжаў па краіне Арыя і яе гарадоў Арыяполь і Трывеж. На яго старонках мы бачым, як на спадарожніку Зямлі Я. Драздовіч размяшчае гарады-крэпасці з бясконцымі сценамі і вежамі і іншымі абарончымі збудаваннямі. Усё гэта з’яўляецца вельмі добрым адлюстраваннем сацыяльна-палітычных працэсаў, якія ідуць на роднай планеце мастака. На першых старонках альбома змяшчаецца карта, на якой пазначаны план першага падарожжа ў горад Арыяполь і другога – ў горад Трывеж. Вельмі цікавымі з’яўляюцца план «В» і тлумачэнні да яго, прысвечаныя дэталёвай карце месяцо-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вага горада Трывежа. Гэта асобная старонка, у альбоме яна размешчана пад № 4, прыгожа распрацавана тушшу з каліграфічнымі подпісамі *карта «Горад Трывеж і ягоныя ваколіцы. План з памяці…» Я. Н. Драздовіч. Восень 1932 г.* [3, с. 11].

Наступныя старонкі дадзенага альбома – гэта канкрэтныя замалёўкі, дэталі, віды апісаных мясцін. Некаторыя з іх уяўляюць самастойныя мастацкія творы. Напрыклад, старонка № 9 *«Расліннасьць узрэчнай даліны, каля Трывезкага шляху, у так званым «Моры Урадлівасьці»*; старонка № 17 *«На станцыі Ariapolis… Пэроны і нешта нейкае…»*; старонка № 19 «Ariapolis…» і інш. Што датычыцца старонкі № 17, то тут Я. Драздовіч стварыў вобраз, які ўбачыў у сваім сне-падарожжы, але тое, што ён стварыў сваімі думкамі і рукамі, засталося тайнай і загадкай для самога мастака. На астатніх старонках альбома змешчаны накіды, замалёўкі і незавершаныя малюнкі. Менавіта тут мастак стварыў свой асаблівы свет са сваёй флорай і фаўнай, сваёй архітэктурай.

Такім чынам, графічны альбом «Жыццё на Месяцы» служыў мастаку крыніцай далейшых распрацовак мастацкіх жывапісных твораў. Напрыклад, лінейны накід панарамы горада Трывежа паслужыў высновай для жывапіснага твора «Трывеж», які цяпер захоўваецца ў музеі старажытнай беларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [3, с. 13].

«Трывеж. Панарама месячнага горада» (1932–1933, памер 61×101 см) значна вылучаецца ў серыі «Жыццё на Месяцы». Дадзены жывапісны твор адрозніваецца ад графічнага больш шырокай панарамай горада і крыху іншым ракурсам кампазіцыі. На першым плане ружовыя і блакітна-фіялетавыя будынкі фантастычнага горада, а большую частку карціны займае велічная іншапланетная панарама – блакітна-зялёны прастор. На дальнім плане, як працілегласць выцягнутым сілуэтам іншапланетных пірамід-вежаў, размешчаны трапецападобныя пабудовы, якія знешне нагадваюць старажытныя гарадзішчы. У цэнтры палатна паміж двух азёр размясцілася пляцоўка з павольнымі ступеньчатамі спускамі да воднай гладзі. Прасветленая ружова-шэра-салатавая гамма панарамы горада паказвае, што гэта ўсё далёкае і загадкавае. Месячны Трывеж – горад-мара мастака, гэта горад гармоніі і хараства, горад спакою і раўнавагі. На адвароце палатна знаходзіцца план горада Трывежа з подпісамі. Злева ад яго намаляваны поўны Месяц і адзначана месца, дзе знаходзіцца горад Трывеж [3, с. 13].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Формы архітэктурных «візій» Драздовіча вельмі рэалістычныя: абарончыя збудаванні, убачаныя ў рэальным жыцці, а таксама пераапрацаваныя выявы пірамід і зікуратаў з падручнікаў па гісторыі і археалогіі. Амаль усе вобразы іншапланетнай архітэктуры, расліннага і жывёльнага свету тоесна злучаны з зямнымі прататыпамі. Матывы зямнога ландшафту пераважаюць у яго касмічных творах.

Дарэчы, сярод графічных твораў з калекцый беларускіх музеяў сустракаюцца назвы і паняцці, якія згадваюцца ў аповесці «У лабірынтах Чорнай Лопаўкі». Гэта «Цырк Платона. «Гара «Сігнал» (1932), «Горад «Гняздо» непадалёку ад цырка Каперніка» (1932) і інш. Аб'ядноўвае гэтыя графічныя аркушы жывапісны твор пад назвай «Фантастычная кампазіцыя», на якім змешчаны амаль такі ж сюжэт з выявамі гары «Сігнал» і мясцовымі жыхарамі.

Астатнія творы з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, якія адносяцца да серыі «Жыццё на Месяцы», адлюстроўваюць архітэктурныя асаблівасці месяцовых гарадоў у краіне Задымленага Неба і адваротнага боку Месяца: «Замак «Граніт – сталіца», «На адваротным баку Месяца», «Абарончы горад» (усе 1932).

Касмічныя пейзажы Я. Драздовіча ў гэтай і ў іншых серыях вельмі матэрыяльныя, як і яго архітэктурныя замалёўкі з натуры, быццам бы мастак бачыў усе, што адлюстраваў на сваіх палотнах сваімі вачыма. Арыгінальнае ўяўленне мастака дазволіла яму зазірнуць у далёкі і невядомы, загадкавы і таму такі прыцягальны таямнічы свет, стварыць свой вобраз незямнога жыцця. Яго матывы архітэктуры на Месяцы уражваюць амаль прарочым прадбачаннем урбаністычных пошукаў сённяшняга дня і дня будучыні.

Яшчэ раз адзначым тое, што малюнкі і палотны Драздовіча касмалагічнага зместу часцей за ўсё былі прызначаны для ілюстравання ці абагульнення яго літаратурных твораў, якія так і не былі надрукаваны. У такім выглядзе ў мастацтве космас да Драздовіча не паказваў ніхто. Гэта былі яго творчыя пошукі. У сваіх мроях і фантазіях мастак стварае і пераносіць на палотны незвычайныя светы з гарадамі і паселішчамі са сваім раслінным і жывёльным светам, іншапланецянамі, якія належаць да розных рас.

Драздовічаўскі касмалагічны пейзаж – незвычайная з'ява ў беларускім мастацтве. Ён стаіць асобна ў беларускім жывапісе і больш блізкі да рускіх касмістаў з аб'яднання «Амаравэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ла», фантастычных і футурыстычных пейзажаў М. Чурлёніса, К. Юона, чым да каго-небудзь з суайчыннікаў [1, с. 66].

Такім чынам, Я. Н. Драздовіч быў пачынальнікам і на працягу доўгага часу адзіным распрацоўнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве.

Тэма космасу і касмічнага была ўласціва мастацтву канца XIX – пачатку XX стагоддзя, але аналагаў творчасці Язэпа Драздовіча ў сусветнай практыцы не існуе. Шмат мастакоў развівалі касмічныя тэорыі ў мастацтве, але толькі Драздовіч змог рэалістычна і дэталёва апісаць сваё касмагарычные светаўспрыманне.

Унікальнасць духоўнай спадчыны Язэпа Драздовіча заключаецца яшчэ ў тым, што яна добра захаваная ў музеях і бібліятэках Беларусі і замежжа, у прыватных калекцыях. Аднак значная частка творчай спадчыны Я. Драздовіча (магчыма, большая) згублена ці загінула бясследна.


1. *Казлоўскі, М.* Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак : успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы / уклад. Міхася Казлоўскага. – Мінск : Маст. літаратура, 2014. – 544 с.

2. *Усава, Н. М.* Славутыя мастакі з Беларусі. Язэп Драздовіч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 43 с.

3. *Цыбульскі, М.* Язэп Драздовіч: «Прыйдзе час…» : зб. матэр., прысвеч. 120-годдзю з дня нараджэння мастака / пад рэд. М. Цыбульскага. – Смаленск, 2008. – 154 с.


## КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗІЦЯЧЫХ І ШКОЛЬНЫХ БІБЛІЯТЭК У ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ


***Н. А. Ляйко,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*
***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


У Беларусі 2018–2020 гг. пройдуць пад знакам Года малой радзімы. Гэта будзе садзейнічаць сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёнаў, фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі насельніцтва краіны, захаванню і папулярызацыі здабыткаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ